# НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

## ПАРТРЭТ НАВУКОЎЦА І ПЕДАГОГА (да 70-годдзя з дня нараджэння Алены Генадзьеўны Калечыц)



12 сакавіка 2010 г. спаўняецца 70 год з дня нараджэння доктара гістарычных навук, прафесара, галоўнага навуковага супрацоўніка ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" Алены Генадзьеўны Калечыц. Юбілей, які мае быць, з'яўляецца выдатнай нагодай для таго, каб грунтоўна асэнсаваць галоўную справу жыцця гэтай унікальнай жанчыны.

Алена Генадзьеўна Калечыц больш за 40 гадоў займаецца айчыннай археалагічнай навукай. У гісторыі яе навуковых пошукаў можна вылучыць чатыры этапы.

Першы этап – навучанне ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР (1967 – 1970 гг.). У студэнцкія гады А.Г. Калечыц прайшла на палявых работах школу мэтраў археалогіі – В.Д. Будзько, Л.В. Грэхавай, А.Н. Рагачова, З.А. Абрамавай, Н.Д. Праслава, што дало магчымасць паступіць у аспірантуру, не маючы гістарычнай адукацыі. Дааспіранцкі перыяд уключаў наступныя адукацыйныя ступені: сярэднюю школу, геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а таксама працу па спецыяльнасці. Гэтая акалічнасць вызначыла міждысцыплінарны характар навуковых даследаванняў А.Г. Калечыц, якія праводзяцца на стыку археалогіі, геамарфалогіі і эвалюцыйнай геаграфіі. Першы грунтоўны вопыт – праца над дысертацыяй на суісканне вучонай ступені кандыдата геаграфічных навук па тэме "Палеагеаграфія эпохі верхняга палеаліту на тэрыторыі Беларусі і Бранскай вобласці" пад кіраўніцтвам кандыдата геолага-мінералагічных навук Леаніда Мікалаевіча Вазнячука. Леанід Мікалаевіч ніколі не ўваходзіў у штат супрацоўнікаў Інстытута гісторыі АН БССР, але на працягу многіх гадоў быў уцягнуты ў важныя праекты, якімі займаліся навукоўцы інстытута. Будучыню выдатнага вучонага прагназаваў Алене Генадзьеўне не толькі яе навуковы кіраўнік, але і мэтр айчыннага геалагічнага цэха акадэмік Г.І. Гарэцкі.

Пасля заканчэння аспірантуры пачаўся другі этап навуковай біяграфіі А.Г. Калечыц, які склаўся ў галіне палеагеаграфіі і геалогіі.

Пачаткам трэцяга этапу ў даследчыцкім працэсе, больш плённага за папярэднія, можна лічыць сярэдзіну 1970-х гг. У той час у Інстытуце гісторыі АН БССР было мала сапраўдных прафесіяналаў у галіне археалогіі, што не адпавядала задачам, якія стаялі перад гэтай навуковай установай. Адной з такіх задач было грунтоўнае археалагічнае вывучэнне ўсходняй часткі БССР. З па-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чатку 1970-х гг. добра падрыхтаваны спецыяліст у гэтым напрамку В.Д. Будзько ўжо не ўваходзіў у штат супрацоўнікаў інстытута, таму, зразумела, яму трэба было знайсці раўнацэнную замену. Кіраўніцтва Інстытута гісторыі АН БССР не памылілася, палічыўшы, што Алена Генадзьеўна праявіць сябе ў дадзенай сферы на такім жа ўзроўні.

З імем Калечыц быў звязаны прарыў у вывучэнні стаянкі Бердыж. Ніхто з даследчыкаў, ні да А.Г. Калечыц, ні пасля яе, не змог даць грунтоўную стратыграфічную характарыстыку гэтай палеалітычнай стаянцы. Прыклаўшы гіганцкія намаганні, гэтая апантаная навуковым пошукам жанчына разгарнула вельмі аб'ёмную работу, якая ахоплівала ўсе без выключэння ўчасткі ўрочышча, у выніку чаго навукоўцам было даказала, што маюць рацыю тыя яе калегі, якія вымяралі Бердыжскую стаянку адным палеалітычным слоем. Пры гэтым Алена Генадзьеўна прадэманстравала майстар-клас у даследаванні даволі складаных працэсаў крыалітагенезу. Менавіта з лёгкай рукі А.Г. Калечыц Бердыжскую стаянку ўжо звыш трэці стагоддзя ў навуковым асяроддзі ўспрымаюць як эталонны разрэз у дачыненні да адпаведных працэсаў.

Аўтары артыкула амаль дваццаць гадоў выкладаюць гісторыю Беларусі і, канешне, звяртаюць увагу на тое, што ва ўсіх падручніках даюцца аднолькавыя даты абсалютнага ўзросту для Бердыжскай і Юравіцкай стаянак. Амаль што сорак гадоў назад юбіляр была ў складзе групы беларускіх і расійскіх спецыялістаў, якія вызначылі гэтыя даты.

У першай палове 1980-х гг. палеагеограф А.Г. Калечыц авалодвае праблематыкай палеаліту Падняпроўя на ўзроўні сістэмных рэканструкцый, аб чым сведчыла яе манаграфія "Першапачатковае засяленне тэрыторыі Беларусі". Юбілярам "з дапамогай дадзеных археалогіі, геамарфалогіі, палеабатанікі, палеанталогіі была распрацавана канцэпцыя першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі, вызначаны час і магчымыя накірункі яе эйкуменізацыі. Была даказана прыярытэтнасць засялення Усходняй Беларусі з поўдня і паўднёвага ўсходу пры захоўванні на працягу ўсяго каменнага веку ўстойлівых узаемасувязей і ўплываў з паўднёва-заходніх рэгіёнаў і Цэнтральнай Еўропы".

Прынцыпова важна адзначыць, што на момант выхаду ўказанай манаграфіі за Аленай Генадзьеўнай замацавалася рэпутацыя нястомнага працаўніка навукі. Кіраўнікі рабочых груп па складанні абласных зводаў помнікаў гісторыі і культуры ведалі, што гэта унікальная жанчына – адна з галоўных іх апор. Цяжка нават сабе ўявіць, як яна магла грунтоўна працаваць па планавых тэмах і паралельна выкройваць час, каб, па-першае, абследаваць помнікі, пра якія раней ужо было вядома; па-другое, выяўляць новыя помнікі, і не толькі палеаліту; па-трэцяе, аператыўна рыхтаваць публікацыі для кніг серыі "Памяць". Улічваючы вялікую колькасць такіх публікацый, можна смела сцвярджаць аб значным укладзе юбіляра ў рэгіяналістыку, краязнаўства.

Калечыц пачала займацца вывучэннем пасожскага перыяду каменнага веку ва Усходняй Беларусі, вырашэннем пытанняў, звязаных з мезалітам і неалітам. Вывучэнне мезалітычных паселішчаў у басейнах Сожа і Бесядзі дазволілі А.Г. Калечыц удакладніць мяжу паміж мікра- і макралітычнымі абласцямі і правесці яе не па Іпуці, а па міжрэччы Бесядзі і Покаці.

Алена Генадзьеўна не толькі адкрывала шмат новага ў пасожскім перыядзе, але і стварыла пляцоўку для дзейнасці ў галіне археалогіі тагачасных гомельскіх студэнтаў: В.А. Літвінава, Н.В. Бычкова, В.І. Сычова, В.П. Пічукова, С.Я. Расадзіна – будучых навукоўцаў-гісторыкаў. Менавіта ў Пасожжы школу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Калечыц праходзілі вядомыя зараз археолагі М.М. Крывальцэвіч, А.А. Макушнікаў.

Чацвёрты этап датуецца 1986 – 2010 гг. Чарнобыльская катастрофа прадвызначыла з'яўленне новых праблемных блокаў у даследчыцкай працы юбіляра. Алену Генадзьеўну ў першую чаргу зацікавіў Мотальскі мікрарэгіён, старажытнасці якога з'яўляюцца тыповымі для заходнепалескага рэгіёна. У гэтым мікрарэгіёне, які размешчаны ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці, яна вяла раскопкі амаль 25 гадоў. Вынік раскопак – больш за 100 тысяч адзінак захавання. Безумоўна, такой колькасці дастаткова, каб па строгіх навуковых крытэрыях стратыфікаваць помнікі каменнага і бронзавага вякоў дадзенага рэгіёна, што і было пераканаўча зроблена юбілярам.

А.Г. Калечыц узняла і вырашыла пытанне аб больш познім пераходзе насельніцтва Беларусі да вытвараючай гаспадаркі. Ёй даказана, што такі пераход адбываўся аднachасова і ў сувязі з агульнаеўрапейскімі працэсамі на захадзе Беларусі, а на яе ўсходзе ўстойлівая раўнавага экасістэм доўгі час стрымлівала гэты працэс.

Разгляд А.Г. Калечыц гістарычных працэсаў у цеснай сувязі з гісторыяй прыроды і праз прызму палеагеаграфічных абагульненняў у рамках праблемы "чалавек – месца пражывання", абарона ў 1995 г. доктарскай дысертацыі "Экасацыяльныя сістэмы каменнага веку Усходняй Беларусі", публікацыя манаграфіі "Чалавек і месца пражывання. Усходняя Беларусь. Каменны век" (2003) сталі зыходнай кропкай для развіцця на Беларусі новага навуковага накірунку – "палеаэкалогія чалавека".

У самым пачатку XXI ст. навукоўца на працягу пяці гадоў канцэнтруецца на вывучэнні свідэрскай культуры, якая адносіцца да фінальнага палеаліту. Пры гэтым ёй ўдалося ажыццявіць культурна-храналагічную ідэнтыфікацыю комплексаў. Аўтар ідэнтыфікацыі абгрунтавана сцвярджае, што помнікаў дадзенай культуры толькі ў межах нашай айчыны існуе не меньш за 100. Размова ідзе перш за ўсё пра заходнепалескі, панёманскі рэгіёны. Знаходзяць помнікі свідэрскай культуры ў сваіх краінах палякі, літоўцы, украінцы.

Па сённяшні дзень названыя праблемныя палі асвойваюцца Аленай Генадзьеўнай. Тэма даследчыцкай працы аддзела археалогіі каменнага і бронзавага вякоў у 2006 – 2010 гг.: *"Матэрыяльная культура насельніцтва тэрыторыі Беларусі ў першабытную і сярэдневяковую эпохі (сістэматызацыя, класіфікацыя і інтэрпрэтацыя крыніц)"*.

Важна адзначыць, што названая тэма ўпісваецца і ў планы рэгіянальных улад. Зараз гомельская абласная вертыкаль надае важнае значэнне населенаму пункту Юравічы. Гэты населены пункт уваходзіць у "Залатое кальцо Гомельшчыны". Адным з ключавых момантаў добраўпарадкавання дадзенага населенага пункта з'яўляецца музеефікацыя стаянкі першабытнага чалавека.

У гэтым напрамку цесна супрацоўнічаюць мясцовая вертыкаль і Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Па лініі інстытута ключавую пазіцыю ў супрацоўніцтве займае Алена Генадзьеўна Калечыц. Яна вельмі ўмела кіруе адпаведнымі раскопкамі, якія носяць комплексны характар. Вопытны археолаг аператыўна сістэматызуе знаходкі, якія нагадваюць аб рэаліях часоў верхняга палеаліту. Сярод іх ёсць і тыя, якія можна аднесці да разраду сенсацыйных. Яскравы прыклад таму – галава маманта з біўнямі. Яна захавалася поўнасцю. Алена Генадзьеўна спадзяецца, што ў калекцыі знаходак неўзабаве будуць рэшткі як мінімум трох мамантаў. Знаходкі мамантаў для нашай айчы-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ны з'яўляюцца унікальнымі.

Доктар гістарычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" Алена Генадзьеўна Калечыц адначасова актыўна займаецца праблемамі першапачатковага засялення Белавежскай пушчы па матэрыялах раскопак шматслойнага паселішча Камянюкі-2 (урочышча Горы) і ставіць пытанне перад уладамі аб перспектывах далейшага выкарыстання дадзенага археалагічнага помніка ў турыстычных мэтах. Трэба спадзявацца, што Брэсцкі аблвыканкам і Камянецкі райвыканкам з усёй сур'ёзнасцю паставяцца да гэтага пытання.

Чацвёрты этап вызначаецца актыўным падключэннем юбіляра да рэдагавання зборнікаў навуковых публікацый, да экспертызы буйных навуковых праектаў. Пад навуковай рэдакцыяй А.Г. Калечыц неаднойчы выходзіла такое выданне, як "Гістарычна-археалагічны зборнік". Як член савета па абароне доктарскіх дысертацый пры ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" яна часта здзяйсняла экспертызу дысертацый па археалогіі.

На аналізуемым этапе Алена Генадзьеўна стала ажыццяўляць навуковыя пошукі ў цесным супрацоўніцтве з вышэйшай школай. З 2003 па 2008 г. яна з'яўлялася прафесарам Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова. Алена Генадзьеўна актыўна ўцягвае ў археалагічныя даследаванні студэнцтва. У 1990-х гг. – пачатку XXI ст. А.Г. Калечыц удзельнічала ў правядзенні археалагічных экспедыцый Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А.С. Пушкіна. 24 верасня 2008 г. Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь прысвоіла Алене Генадзьеўне Калечыц вучонае званне прафесара па спецыяльнасці "Гісторыя" (спецыяльнасці 07.00.06 – "Археалогія", 11.00.04 – "Геамарфалогія і эвалюцыйная геаграфія"). Важна таксама адзначыць, што вучні прафесара пісалі і пішуць дысертацыі па праблемах, акрэсленых ёй.

Навуковы патэнцыял юбіляра, арганізатарскія здольнасці Алены Генадзьеўны прадвызначылі яе відавочны кар'ерны рост за гады працы ў Інстытуце гісторыі НАНБ. У гэтай навуковай установе яна прайшла наступныя службовыя ступені: з 1970 па 1974 г. – малодшы навуковы супрацоўнік; з 1974 па 1996 г. – старшы навуковы супрацоўнік; з 1996 па 2001 г. – вядучы навуковы супрацоўнік; з 2001 па 2007 г. – загадчык аддзела археалогіі каменнага і бронзавага вякоў; з 2007 г. – галоўны навуковы супрацоўнік. Дарэчы, прафесар адзначае ў 2010 г. два юбілеі: 70-ю гадавіну з дня нараджэння і 40-ю гадавіну знаходжання ў складзе супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАНБ.

Такім чынам, А.Г. Калечыц унесла сур'ёзны ўклад у развіццё беларускай археалагічнай навукі. Яе навуковая праца адзначана медалём "За працоўныя заслугі", граматамі. Віншуючы Алену Генадзьеўну з юбілеем, ёсць усе падставы спадзявацца, што яна будзе браць новыя вышыні ў навуковых даследаваннях.

М.А. КОРШАК,
М.В. СТРАЛЕЦ

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова